© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012


# Бацькаўшчына

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUSČYNA“ („VATERLAND“)
Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14
Цана: Нямеччына: на год — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; ЗША і Канада: на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 д. Ангельшчына й Аўстралія: 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. Бэльгія: 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. Францыя: 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. Аргентына: 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. Перасылка лётніцкай поштай каштуе падвойна. Падвойныя нумары каштуюць падвойна. Паадзіночныя нумары газэты разам з «Каласкамі» ўважаюцца за падвойныя.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna“,
Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER “THE FATHERLAND„

№ 9 (445) Нядзеля, 1 сакавіка 1959 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 13


## Яшчэ адна незалежная рэспубліка

Доўгагадовы канфлікт на Цыпры й за Цыпр у прынцыпе палагоджаны. У панядзелак 23-га студзеня адначасна ў Нікозіі на Цыпры, у Анкары, Афінах і Лёндане было апублікаванае пагадненьне, выпрацаванае на лёнданскай канфэрэнцыі прадстаўнікамі Англіі, Грэцыі й Турцыі, а таксама прадстаўнікамі грэцкага насельніцтва абтоку.

На аснове гэтага пагадненьня абток Цыпр павінен найпазьней 19-га лютага 1960 году атрымаць сваю незалежнасьць. Новая дзяржава бярэ свой пачатак з двух міжнародных умоваў: папершае, з пагадненьня паміж Цыпрам, Грэцыяй, Турцыяй і Англіяй аб гарантыях для абтоку і, падругое, з пагадненьня аб супрацоўніцтве паміж Цыпрам, Турцыяй і Грэцыяй. Удзельнікі пагадненьня аб гарантыях забавязваюцца забясьпечыць незалежнасьць і бясьпеку Цыпрскай Рэспублікі, забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё асноўных прынцыпаў цыпрскай канстытуцыі й не дапусьціць да падзелу абтоку або далучэньня яго да іншай краіны. Англія зракаецца сувэрэннасьці над Цыпрам за выняткам дзьвёх мясцовасьцяў, дзе паложаныя ангельскія ваенныя базы. Апрача таго, Англія захоўвае за сабой права свабодна карыстацца некаторымі шасэйнымі дарогамі, портам у Фамагуста, лётнішчам у Нікозіі, а таксама права свабодных палётаў над тэрыторыяў абтоку.

Будучая канстытуцыя Цыпрскай Рэспублікі мае быць распрацаваная на ўзор амэрыканскай. Узгодненыя ўжо цяпер ейныя галоўныя рысы прадугледжваюць, што прэзыдэнтам павінен быць Цыпрыец грэцкага паходжаньня, а заступнікам прэзыдэнта — Цыпрыец турэцкага паходжаньня.

Заканадаўчая ўлада будзе належыць, з аднаго боку, лякальным парлямантам грэцкага й турэцкага насельніцтва і, з другога, агульнаму цэнтральнаму парляманту. Вялічыня гэтых парлямантаў павінна быць азначаная пазьней. Пагадненьне, аднак, прадугледжвае, што цэнтральны парлямант павінен складацца ў 70% з грэцкіх і ў 30% з турэцкіх Цыпрыйцаў. Гэтая прапорцыя павінна быць таксама захаваная і ў кабінэце міністраў. Правы й інтарэсы турэцкай мяншыні перад грэцкай бальшынёй павінна гарантаваць права вэта прэзыдэнта й заступніка прэзыдэнта рэспублікі (у гэтым выпадку важнае права вэта заступніка прэзыдэнта).

Адмысловы Вярхоўны Суд, складзены з судзьдзяў-Цыпрыйцаў грэцкага й турэцкага паходжаньня, а таксама з юрыстых-чужынцаў, мае вырашаць спрэчкі ў інтэрпрэтацыі канстытуцыі.

Так, у галоўных рысах, выглядае дзяржаўна-палітычная структура, якая хутка мае быць зрэалізаваная на Цыпры на аснове пагадненьня ў Лёндане.

Што-ж уяўляў сабой Цыпр раней?

У старажытнасьці — сказкавы сьвет грэцкіх багоў, Цыпр трапляе пад рымскае, а пазьней турэцкае панаваньне. У 1878 годзе, пагадненьнем паміж Англіяй і турэцкім султанам, Ангельцы пераймаюць адміністрацыю абтокам. У руках Англіі ён адыгрывае важную стратэгічную ролю адначасна й для паўстрымоўваньня імкненьня царскай Расеі прарвацца з Чорнага мора ў Міжземнае і для ахоўваньня сваіх імпэрыяльных інтарэсаў на ўсім Усходзе. Пасьля Другой сьветавай вайны Цыпр быў для Ангельцаў зручнай базай для аховы эксплятаваных імі блізкаўсходніх нафтавых крыніцаў і, як такі, набыў асаблівае значэньне пасьля страты кантролю над Эгіптам і ў сувязі зь няўстойлівым палажэньнем у раёне Блізкага Ўсходу. Гэтым і тлумачыцца тое, што некаторыя імпэрыяльна настроеныя кансэрватыўныя колы Англіі не дапускалі й думкі, што й гэтая апора ангельскіх інтарэсаў у гэтым раёне можа быць зьліквідаваная або падмінаваная.

Тымчасам, зусім натуральна, палажэньне, пры якім у ваднэй з цывілізаваных краінаў Эўропы захоўваўся яшчэ каляніяльны рэжым, ніяк не падыходзіла да палітычнай маралі нашага часу, тым больш, што Англія ўсьцяж прызнае самакіраўніцтва й незалежнасьць адсталым палітычна народам Афрыкі й Азіі. Вялікі ўплыў на лібэральнае вырашэньне цыпрскага пытаньня меў таксама ціск з боку сусьветнай грамадзкай апініі — перш за ўсё з боку Арганізацыі Задзіночаных Нацыяў, дзе справа Цыпру ўжо ад пяці год стаяла на парадку дня.

Аднак, у запраўднасьці, праблема Цыпру была ўзьнятая самым насельніцтвам абтоку, якое дамагалася ажыцьцяўленьня свайго права на самавызначэньне, і ня толькі дэманстрацыямі й забастоўкамі, але й збройным змаганьнем. Гэтае змаганьне каштавала каля 1000 людзкіх ахвяраў і з боку Цыпрыйцаў і ангельскіх жаўнераў, дзесяткі тысяч інтэрнаваных у ангельскіх канцэнтрацыйных лягерах, выклікала абвешчаньне на абтоку надзвычайнага палажэньня. Трагічнасьць палажэньня палягала перш за ўсё ў тым, што Цыпр заселены дзьвюма этнічнымі групамі — Грэкамі й Туркамі, кажная зь якіх, не без падбухторваньня з кантынэнту, імкнулася вырашыць палітычную будучыню свае бацькаўшчыны парознаму: прадстаўнікі грэцкай часткі насельніцтва дамагаліся далучэньня абтоку да Грэцыі, а турэцкай — падзелу абтоку на дзьве часткі. Гэта, апрача змаганьня Цыпрыйцаў паміж сабой, прывяло да завайстрэньня дачыненьняў паміж Грэцыяй, Турцыяй і Англіяй і падрывала супрацоўніцтва паміж краінамі Захаду перш за ўсё ў галіне абароны. Таму вырашэньне цыпрскай праблемы было сустрэтае зь вялікай палёгкай і задаваленьнем як у заходніх палітычных і вайсковых колах, гэтак у Арганізацыі Задзіночаных Нацыяў. Задаволеныя былі таксама грэцкія й турэцкія ўдзельнікі пагадненьня. Навет Ціта выказаў надзею, што цяпер можна будзе ўмацаваць, пахіснуты спрэчкамі за Цыпр, Балканскі абаронны саюз, у які, як ведама, уваходзіць Югаславія. Ня ведама яшчэ, якое канчальнае становішча да новага статусу Цыпру зойме ультраправая арганізацыя грэцкіх тэрарыстых — ЭОКА і ці ўмова зможа наагул забясьпечыць мір і супрацоўніцтва абедзьвюх частак насельніцтва абтоку. Гэта пакажа будучыня.

Яўна незадаволенымі аднак, як і заўсёды ў такіх выпадках, засталіся камуністыя. Ня толькі на Цыпры, але і ў Крамлі. Ім не падабаецца, што Англія захоўвае на Цыпры свае ваенныя базы. Гэтак, ужо 13-га лютага, пасьля ўзгадненьня ў Цурыху грэцка-турэцкага пляну аб будучыні Цыпру, маскоўскае радыё ў перадачы ў грэцкай мове цьвердзіла, што гэты плян «рэпрэзэнтуе ваенныя інтарэсы каляніяльных дзяржаваў». Мы аднак бачым, што ў гэтых каляніяльных дзяржаваў Захаду хутка не застанецца нічога каляніяльнага. І калі яны сяньня захоўваюць і разбудоўваюць свае вайсковыя базы, дык робяць зусім правільна, каб ня стацца, разам з мітраполіямі, калёніямі агрэсыўнага расейска-бальшавіцкага імпэрыялізму.

**Ю. Дубовік**

## Масква дыктуе

3-га студзеня ў Менску, на ўрачыстым паседжаньні, прысьвечаным саракагодзьдзю БССР і КПБ, Хрушчоў у сваёй прамове аўтарытэтна прадыктаваў: «Сельская гаспадарка вашай рэспублікі ў далейшым будзе спэцыялізавацца ў кірунку інтэнсыўнай малочнай і мясной жывёлагадоўлі, мясной сьвінагадоўлі, разьвядзеньня вадаплаўнай птушкі, на вытворчасьці бульбы, ільну-даўгунцу і цукровых буракоў».

Не пасьпеў Хрушчоў сказаць гэтую фразу, як яна сталася для бэсэсэраўскіх апаратчыкаў непарушнай догмай. Пачынаючы ад 4-га студзеня, бадай ня было ніводнай беларускай савецкай газэты, у якой мы не знаходзілі-б такога сказу: «Сельская гаспадарка нашай рэспублікі ў далейшым будзе спэцыялізавацца ў кірунку ...» — і далей, як у цытаце Хрушчова.

Там-жа, у камэнтарах да сямігадовага пляну, мы чытаем, што перад БССР ставіцца заданьне за наступныя сем год забясьпечыць самую сябе ... збожжам.

Што з гэтага вынікае? З аднаго боку, сельскую гаспадарку БССР пхаюць на шлях вузкой спэцыялізацыі, а з другога — БССР ня мае навет дастаткова свайго хлеба.

Няма тут патрэбы гаварыць, што разумная, рацыянальная спэцыялізацыя, гэта значыць максымальнае выкарыстаньне гаспадарчых магчымасьцяў дадзенай краіны прыносіць гэтай краіне толькі карысьць. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі спэцыялізацыя не праводзіцца за кошт іншых, жыцьцёва неабходных галінаў гаспадаркі — калі вонкавыя сілы ня зводзяць дадзеную краіну да ролі дастаўшчыка пэўных прадуктаў, якія адначасна поўнасьцю залежны ад даставаў іншых прадуктаў звонку. БССР ужо знаходзіцца ў гэткім палажэньні, і па гэтым шляху цяпер пхаюць яе далей. Больш як дзіўна, што БССР — гэтая «калгасна-індустрыяльная» рэспубліка, — як яе называе савецкая прапаганда, да гэтага часу ня можа забясьпечыць насельніцтва сваім хлебам і мусіць прывозіць яго звонку.

А такое палажэньне ня толькі ў сельскай гаспадарцы, але і ў прамысловасьці. Прыкладам, БССР вырабляе вялізарныя саракатонныя грузавікі-самазвалы, — выкарыстаць якіх у Беларусі немагчыма, і адначасна адчуваецца войстрая нястача самых простых сельскагаспадарчых машынаў і, асабліва, запасных частак.

Хрушчоў у сваёй прамове на XXI-ым зьездзе гаварыў аб патрэбе змаганьня з гэтак званым «месьніцтвам», з тэндэнцыяй да «замкнёнай» гаспадаркі. Слухаючы яго можна было падумаць, што некаторыя эканамічныя раёны, а, значыцца, і паасобныя рэспублікі, імкнуцца — наўсуперак здароваму розуму — да даўно аджытай эканамічнай аўтаркіі. Але справа выглядае зусім ня так. Як гэта не парадаксальна гучыць, але крытыкаванае Хрушчовам месьніцтва — гэта натуральны вынік цераразьмернай цэнтралізацыі, якая існуе й далей, ня гледзячы на ўсе хрушчоўскія рэформы.

Паасобныя рэспублікі не зьяўляюцца гаспадарамі свайго жыцьця. Яны ня могуць кіравацца эканамічнай мэтазгоднасьцяй і дамаўляцца паміж сабою або зь іншымі краінамі аб абмене прадуктамі свае вытворчасьці. Аб усім пастанаўляе цэнтр.

На XXI-ым зьездзе першы сакратар ЦК КПБ падаў такі прыклад: сёлета станкабудаўнічыя заводы БССР павінны атрымаць 930 камплектаў гідрапрыводаў, а ўсемагутны Дзяржплян выдзяліў толькі 320 камплектаў. Рэшту давядзецца выраблаць на месцы, ня гледзячы на вялізарныя страты. А каб БССР была свабоднай у сваіх дзеяньнях, яна магла-б замовіць патрэбныя ёй гідрапрыводы на спэцыялізаваных заводах Украіны, а ў сябе разьвіць вытворчасьць тых прадуктаў, якія эканамічна сябе аплачваюць.

Як бачым, усе гутаркі аб «пашырэньні правоў саюзных рэспублік» аб «замацаваньні іхнай эканомікі» — гэта пустыя словы. У эканамічным дачыненьні крамлёўскія валадары імкнуцца зрабіць зь іх сваіх спэцыялізаваных дастаўшчыкаў, адабраць у іх магчымасьць самастойнага гаспадараньня.

**У. Н.**

## Польшча і XXI зьезд КПСС

Аб значэньні XXI-га зьезду ў савецкай прэсе было апублікавана шмат артыкулаў. Але як праца гэтага зьезду тлумачыцца ў іншых краінах, напрыклад, у Польшчы? Таксама, як ў Савецкім Саюзе, ці інакш? Вось адказ на гэтыя пытаньні.

Нехта сказаў аднойчы, што ў выпадку патрэбы ў працах Леніна можна знайсьці цытату, каб падтрымаць усякую тэзу. Прыблізна тое-ж самае, але ў крыху меншай ступені, можна сказаць аб вялізарным матар'яле XXI-га зьезду.

Польскія камуністыя, якія камэнтуюць XXI-шы зьезд, зьвяртаюць асноўную ўвагу на чатыры пункты дыскусіі.

Пералічым іх і разьбярэм значэньне кажнага зь іх паасобку. З таго часу, як у кастрычніку 1956-га году Гамулка прыйшоў да ўлады, асноўным лёзунгам польскай кампартыі быў лёзунг аб «польскім уласным шляху да сацыялізму». Вось чаму з шасьцігадзіннай прамовы Хрушчова польскія камуністыя ўзялі для сваёй асноўнай ацэны толькі некалькі кароткіх фразаў. У гэтай частцы сваёй прамовы Хрушчоў заявіў, што ня існуе камуністычных партыяў вышэйшага і ніжэйшага рангу. Паводля ягоных слоў, сацыялістычны лягер складаецца з шэрагу краінаў, кажная зь якіх будуе сацыялізм згодна з агульным законам марксізму-ленінізму, але тым шляхам, які адпавядае нацыянальным асаблівасьцям і традыцыям.

У гэтай заяве Хрушчова няма нічога новага. Асноўнае разыходжаньне паміж польскімі камуністымі і іншымі камуністычнымі партыямі палягала ня ў спрэчцы аб іхным праве будаваць сацыялізм тым шляхам, які адпавядаў-бы польскім нацыянальным асаблівасьцям, а ў тым, наколькі польскія камуністыя могуць адыйсьці ад агульных прынцыпаў, прынятых іншымі камуністычнымі краінамі. Пры гэтым яны не павінны пераходзіць тэй неазначанай мяжы, якая аддзяляе добрых і ляяльных камуністых ад рэвізіяністых.

На думку шмат якіх артадаксальных камуністых як у Польшчы, так і па-за ейнымі межамі, цяперашняе кіраўніцтва польскай камуністычнай партыі трымаецца палітычнага курсу, які надта блізкі да адкрытага рэвізіянізму. Гэта даты-

(Заканчэньне на 2-ой бач.)

## Хмары над Бэрлінам

Запраўды сьвет мусіць быць цяжка хворы, калі ў газэтах шукае рэцэптаў, знакаў палепшаньня. Кажнай раніцай людзі сквапна хапаюць газэты, прыкладаюць вуха да радыя: можа праз ноч здарылася нешта новае, можа ўчора Хрушчоў сказаў нешта пацяшаючае, можа чарговы міжнародны крызыс зьменшыўся. Наіўныя мэлянхалійна прыгадваюць пачатак сьнежаня, калі Мікаян пацяшаў амэрыканскіх мільянэраў і фільмовых зорак: «Не перайммайцеся зашмат войстрым тонам нотаў і прамоваў Мікіты. Добры гандляр заўсёды дамагаецца больш, чымся спадзяецца атрымаць. Патаргуемся, дамовімся ...»

Хрушчоў із свайго боку ня пераняўся абяцаньнямі Мікаяна, бо завайстрыў тон сваіх выказваньняў у справе бэрлінскай праблемы. Апошняе ягонае выступленьне ў Туле было шчытам дыпляматычнае грубасьці й брутальнасьці. Ён проста сказаў: джэнтэльмэны, скочце ў сьцюдзёную ваду й ацьверазейце, бо прыкра расчаруецца той, хто думае, што калі нехта бяз нашае згоды спрабуе прабіцца ў Бэрлін, не пачнецца страляніна. Савецкія жаўнеры стаяць ува Ўсходняй Нямеччыне не па тое, каб гуляць у лапту!

Хрушчоў, бачна, пераняў тактыку свайго ворага нумар першы — Далеса, якую гэты апошні назваў «хаджэньнем на мяжы вайны». Гэтая сьмелая тактыка дала Далесу некалькі перамогаў у сьцюдзёнай вайне. Але яна вымагае моцных нэрваў, таму й бэрлінскую гульню выйграе той, хто не заломіцца нэрвова.

Да гэтага часу заходнія дыпляматы ня выяўлялі вялікае нэрвовасьці, але пэўна-ж зь непакоем думаюць, што толькі тры месяцы застаецца да 27-га травеня й што да гэтага часу трэба знайсьці нейкую разьвязку.

У сваіх апошніх нотах заходнія дзяржавы запрапанавалі скліканьне нарады міністраў чатырох вялікіх дзяржаваў дзеля разгледжаньня нямецкай праблемы «ўва ўсіх ейных аспэктах». Каб не дражніць Хрушчова, гэты раз у нотах ужо ня прыгадваецца ні аб эўрапэйскай бясьпецы, ні аб вызваленьні народаў Усходняй Эўропы. Гэта сумнае ўступства зразумелае, калі ўзяць на ўвагу складанасьць бэрлінскай праблемы. Выступленьне з Бэрліну было-б найгоршай кампрамітацыяй для заходніх дзяржаваў і мела-б трагічныя наступствы. Таму ня дзіва, што — хаця й зь неахвотай — яны згодна асьветчылі, што ня ўступяць навет перад небясьпекай вайны. Цяпер паўстае пытаньне, ці ўступіць Масква? Можна думаць, што калі ўбачыць здэтэрмінаваную наважанасьць і станоўчасьць з боку Захаду, Хрушчоў злагодзіць тон, бо ён таксама баіцца вайны. Хрушчоў будзе мець яшчэ адну нагоду адыйграць ролю анёла міру, а пры гэтым вытаргаваць сабе пэўныя канцэсіі, як пашырэньне гандлю з Захадам. Пры гэтым было-б шмат задаволеных, бо Ангельцы толькі мрояць і сьняць аб гэтым, ды й амэрыканскія мільянэры таксама хацелі-б павялічыць свае прыбыткі. Толькі бэрлінская праблема застанецца неразьвязанай і прыладай далейшых шантажоў для бальшавікоў. Нажаль, тут Масква мае вялікія магчымасьці манэўраў і, залежна ад сваіх патрэбаў, завайстраць, або злагоджваць міжнароднае напружаньне, а гэтым самым выматваць нэрвы сваіх праціўнікаў.

Рэч зразумелая, ідэяльнай разьвязкай гэтай праблемы быў-бы плебісцыт ува ўсёй Нямеччыне. Аднак бальшавікі ня маюць ілюзіяў што да вынікаў такога плебісцыту й на яго ня згодзяцца. Да гэтага іх трэба змусіць і ня пропаведзямі аб маральнасьці, дэмакратычнасьці і справядлівасьці, бо гэта тое самое, што намаўляць ваўка, каб ня душыў авечак бязь іхнай згоды таму, што гэта не дэмакратычна й няэтычна.

Каб бальшавікоў змусіць да ўступак або паўстрымаць іхнюю экспаньсію, трэба мець адвагу «хадзіць па мяжы вайны» і толькі такім чынам можна абараніць мір.

Падарожжа Макміляна ў Савецкі Саюз выклікала шмат цялячых захапленьняў і наіўных надзеяў. Макміляна — чаруючы дыплямат, надзвычайны аратар, нагаварыў маскоўскім верхаводам шмат камплімэнтаў, а Хрушчова навет зрабіў найбольшым гэроем другой сусьветнай вайны. Аднак вельмі сумлеўна, што ён станецца сырэнай або міталягічным Арфэем ...

Як-бы там ня гучэў супольны камунікат зь цяперашніх маскоўскіх перамоваў, бэрлінская праблема яшчэ доўга будзе трывожыць сьвет. За палітычныя памылкі трэба дорага й доўга расплачвацца.

**пс.**

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012



# Сярод суродзічаў у Амэрыцы

(Заканчэньне з папярэдніх нумароў)

IV

## Царква, школьніцтва, выдавецкія справы й праблема асыміляцыі

На заканчэньне маіх спасьцярогаў і ўражаньняў з пабыту ў Амэрыцы неабходна коратка спыніцца на пытаньнях, якія зьяўляюцца агульнымі й супольнымі для ўсіх беларускіх асяродзьдзяў у Задзіночаных Штатах. Гэта пытаньні, якія паказаныя ў самым загалоўку гэтай часткі артыкулу.

Трэба з прыемнасьцю адцеміць, што царкоўнае жыцьцё сярод праваслаўных Беларусаў, — а іх-жа, як ведама, пераважаючая бальшыня, — у наведаных мною асяродзьдзях наладжанае наагул добра. Гэта зьўляецца бясспрэчнай заслугай герарха Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы архіяпіскапа Васіля, далей падпарадкаваных яму герархічна беларускіх праваслаўных сьвятароў і, напасьледак, у ня меншай меры й самых вернікаў.

Гэтак у Нью Ёрку існуе сабор БАПЦ імя сьв. Кірылы Тураўскага, у якім сыстэматычна служаць Уладыка Васіль і мітрафорны пратаярэй Хведар Данілюк. Добра абсталяванае абшырнае царкоўнае памяшчэньне сабору займае цэлы паверх Беларускага Народнага Дому ў Брукліне, на партэры якога знаходзяцца таксама абшырная заля грамадзкіх зборак і імпрэзаў, а так-жа два пакоі для розных арганізацыяў. У Кліўлэндзе настаяцелем прыходу й царквы Цудатворнага Абраза Жыровіцкай Божай Маці зьяўляецца мітрафорны пратаярэй М. Макарэвіч, а ў Нью Брансьвіку на чале беларускага прыходу імя Жыровіцкае Божае Маці стаіць мітрафорны пратаярэй Сьцяпан Войтэнка.

Трэба падчыркнуць з асаблівым націскам, што ў Амэрыцы царква кажнага веравызнаньня мае шмат шырэйшыя функцыі й большую адыгрывае ролю, чымся ў Эўропе ды і ў іншых краінах вольнага сьвету, а таму на царкоўныя справы тут нармальна зьвяртаецца асабліва вялікая ўвага. Царква ў Амэрыцы мае на мэце ня толькі заспакаеньне рэлігійных патрэбаў вернікаў, але, раўналежна з гэтым, яна выконвае й важныя нацыянальна-грамадзкія функцыі. Яна зьяўляецца нацыянальным лучнікам між людзьмі дадзенае нацыянальнасьці, праводзіць у жыцьцё цэлы рад важных грамадзкіх мерапрыемстваў, паддзержывае, замацоўвае й пашырае нацыянальную сьведамасьць і тым самым зьяўляецца важным фактарам у вабароне перад нацыянальнай асыміляцыяй. Пры царкве ў ладнай меры засяроджваецца нацыянальнае, грамадзкае й культурнае жыцьцё дадзенае нацыянальнасьці.

Ад многіх нашых суродзічаў, і гэта ня толькі ад індэфэрэнтных ў царкоўна-рэлігійных справах, але й ад практыкуючых вернікаў, часта прыходзілася мне чуць нараканьні, што некаторыя беларускія царкоўныя дзеячы і часьць вернікаў ня хочуць разумець і талераваць вышэй адцемленых шырокіх нацыянальна-грамадзкіх заданьняў царквы й сьведама ці нясьведама стараюцца звузіць яе вельмі адказныя й пачэсныя функцыі ды абмежаваць іх да вылучна рэлігійных справаў. Для гэтых людзей царква сталася самамэтай, ухіляючыся быць таксама й дапаможнікам нацыянальна-грамадзкага жыцьця.

Наступнае нараканьне, якое мне прыходзілася часта выслухоўваць, гэта тое, што некаторыя нашыя суродзічы, у тым ліку й некаторыя із сьвятарскага асяродзьдзя, хацелі-б усё грамадзкае й нацыянальнае жыцьцё звузіць і абмежаваць вылучна да царкоўнай дзейнасьці, ня хочучы пагадзіцца з фактам, што, апрача царкоўных патрэбаў, існуе цэлы рад іншых ня менш важных нацыянальна-грамадзкіх заданьняў, якія паводля свайго характару з царквой ня маюць нічога супольнага. Як адзін з прыкладаў такога палажэньня, мне прыводзілі факты, што царква непрапарцыянальна да ўсіх нацыянальна-грамадзкіх патрэбаў, разам узятых, абсарбуе грамадзкі бюджэт, у сувязі з чым іншыя дзялянкі нацыянальнае дзейнасьці, прыкладам выдавецкая дзейнасьць, ня могуць разьвівацца.

Такі стан прыводзіць да частых, з грамадзкага гледзішча некарысных, спрэчак і непаразуменьняў. Закранаючы гэтае далікатнае пытаньне, — што раблю ў імя аб'ектыўнасьці, — хацелася-б выказаць пажаданьне, каб усе нашыя людзі ў Амэрыцы здабыліся на максімум добрае волі й зразуменьня важнасьці справы ды наладзілі найбольш правільныя з нацыянальнага гледзішча ўзаемадачыненьні між царквой з аднаго боку і сьвецкімі арганізацыямі — з другога.

Паколькі праваслаўныя Беларусы абнятыя царкоўнай дзейнасьцю калі і няпоўна, дык усё-ж больш-менш здавальняюча, патолькі Беларусы каталікі пазбаўленыя і гэтага. На ўсю Амэрыку ёсьць толькі адзін актыўны беларускі каталіцкі сьвятар кс. П. Чарняўскі, які знаходзіцца ў Чыкаго. Не гаворачы аб іншых беларускіх асяродзьдзях, у якіх, як напрыклад у Кліўлэндзе, пражывае мала Беларусаў каталіцкага веравызнаньня, адсутнасьць беларускага каталіцкала сьвятара ў Нью Ёрку адчуваецца вельмі балюча. Тут жыве шмат Беларусаў каталікоў з новае эміграцыі, а таксама ёсьць вялікая колькасьць спалянізаваных Беларусаў каталікоў із старое эміграцыі, сярод якой актыўны каталіцкі сьвятар мог-бы знайсьці шырокае поле для нацыянальнае працы. Варта, каб нашыя каталіцкія сьвятары ў Эўропе сур'ёзна падумалі аб гэтым.

У ўмовах эміграцыйнага жыцьця, перадусім-жа амэрыканскага, вялікую нацыянальную ролю можа адыграць дадатковая да ангельскай беларуская школа беларусаведы. Яна зьяўляецца найважнейшым фактарам дзеля абароны перад нацыянальнай асыміляцыяй нашага маладога пакаленьня, якое ўжо ня помніць Бацькаўшчыны або й нарадзілася на чужыне.

У наведаных мною пунктах існуюць нядзельныя або суботнія школы беларусаведы, а ў Ньюёркаўскай школе, апрача энэргічнага й шчыра адданага беларускай справе грамадзка-культурнага працаўніка сп. М. Тулейкі, як загадчыка школы, працуе так-жа рад іншых настаўнікаў, як Уладыка Васіль, сп-ня Н. Орса, др. А. Орса, др. Я. Станкевіч, сп. Ю. Станкевіч і інш. У Кліўлэндзе беларускую школу вядзе сп. К. Кіслы, у Нью Брансвіку — сп. Ф. Родзька, у Саўт-Рывэры — сп. Б. Шчорс.

Здавалася-б, што із справай навучаньня беларусаведы й нацыянальнага ўзгадаваньня моладзі ўсё ў парадку. Нажаль, далёка ня гэтак. Беларускія школы то існуюць, але іх наведвае вельмі малая колькасьць дзяцей і моладзі. Бальшыня іх гэтымі школамі не абнятая. Многія бацькі, таксама й спасярод нават актыўнай інтэлігенцыі, ня хочуць зразумець вялікага нацыянальнага і ўзгадавальнага значэньня беларускае школы на чужыне і не пасылаюць у яе сваіх дзяцей.

Такое палажэньне ня можа быць талераванае або здадзенае на самацёк. З боку нашых арганізацыяў і паасобных грамадзян тут неабходная шырокая ініцыятыва, упорыстая і сыстэматычная ўсьведамляльная акцыя, праводжаная як па лініі агульнай, гэтак і індывідуальнай з паасобнымі бацькамі.

(Заканчэньне з 3-яй бач.)

З радыёвай хвалі «Вызваленьне»

# Выгубленыя бальшавікамі - 9

Табе, народ мой, згібнуты ў аковах,
З-пад сэрца песьню гэтую пяю,
І, ускрашаючы мінуўшчыну нанова,
Выказваю цяпершчыну тваю.

**Янка Купала.**

☆

### МОЛАДЗЬ З ЗАХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ

Сярод студэнтаў Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту ў 1927—28 навучальным годзе зьявіліся новыя людзі з-за кардону. Гэта былі гадаванцы беларускіх гімназіяў Заходняе Беларусі з пад польскае акупацыі.

Прыйшлі яны ў Менск на сваю рызыку. Справа была адмыслова арганізаваная. Таму колькі дзесяткаў хлапцоў і дзяўчат бесьперашкодна перайшлі трыманую пад пільнай аховай мяжу. Бязь ніякіх эгзаменаў усіх залічылі на другі курс навучаньня, далі дзяржаўныя стыпэндыі, прыдзялілі інтэрнаты. Падаўшыся ўвішнай савецкай прапагандзе, гімназістыя паверылі, што ў БССР ня толькі прастарней, чымся ў тагачаснай Заходняй Беларусі, але й зусім прасторна, а незалежна, як у сваім доме. Іх прывабілі ў Менск нібы спраўджанай нацыянальна-палітычнай свабодай і магчымасьцяй здабыцьця вышэйшае асьветы.

Напачатку афіцыйна іх называлі палітычнымі эмігрантамі, дакучліва выкарыстоўваючы дзеля прапаганды сярод студэнцтва. На кажным студэнцкім сходзе заўсёды хто-небудзь зь іх выступаў. Аджа зьмест прамоваў выходзіў за межы вымаганае ідэялягічнае вытрыманасьці, калі юнакі з Заходняе Беларусі ўсхвалявана апавядалі пра перасьледы беларускае справы й пагвалчаньне нацыянальных правоў народу. А слухачы, узгадаваныя ў савецкіх умовах, за гэтымі словамі бачылі собскае жыцьцёвае змаганьне. У гэтым была ўжо небясьпека з гледзішча афіцыйнага, бо пачуцьці прамоўцаў і слухачоў зьбягаліся і ў сваёй лучнасьці прамаўлялі словамі паэты пра ўсю й да ўсяе Беларусі:

На ростані ўсходня-заходніх дарог
Цябе, дарагая, яны ўкрыжавалі.

Вось чаму падобныя прамовы былі адно часовай зьявай. Мода на іх хутка мінула, заходнікі згубіліся ў вагульнай масе студэнцтва. У 1930 годзе яны скончылі ўнівэрсытэт. На выпускных вечарох ужо ніхто не гаварыў пра былых палітэмігрантаў. Маўчалі й яны. На моцы набірала палітыка тэрору, ськіраванага ў першую чаргу супраць найбольш нацыянальна дзейнае часткі народу ў васобе ягонае інтэлігенцыі ды нават супраць тых, да каго рэжым ня меў даверу.

За колькі гадоў навучаньня ў сталічным Менску заходня-беларуская моладзь дазналася, што бальшавізм і свабода — розныя рэчы, што БССР, выдаванай ім за абетаваную краіну нацыянальнага росквіту, валадарнічае чужацкі захопнік і перасьледнік. Пад цяжарам штодзённае савецкае рачаіснасьці адыходзілі ў нябыт ружовыя спадзяваньні, якімі цешылі сябе юнакі, калі іх вялі ў БССР.

Неўзабаве па сканчэньні Ўнівэрсытэту сталіся й яны ахвярамі перасьледу. У 1933 годзе іх арыштавалі, далучыўшы да гэтак званага «Беларускага Нацыянальнага Цэнтру», кіравецтва якім прыпісалі тры гады таму прывезеным у Менск паслом-грамадаўцам. Сярод арыштаваных апынуўся й былы лукіскі вязень, малады паэта, аўтар зборніку вершаў «Лукішкі» Алесь Салагуб. У Менск ён прыйшоў зь незагоенымі яшчэ ранамі ад катаваньняў на Лукішках, каб праз колькі гадоў назаўсёды зьнікнуць у засьценках ГПУ. Нядоўга па арышце былі пашырыліся чуткі, што яго расстралялі. Варта адзначыць, што нават пасьля ўмоўных рэгабілітацыяў імя Салагуба ў літаратурных аглядах не называюць.

Гэткі лёс напаткаў сялянскіх сыноў і дачок з Заходняе Беларусі толькі таму, што яны сталіся часьцінай нашае інтэлігэнцыі, прыйшлі з-за кардону, створанага ў свой час наперакор волі нашага народу. Іх зьвінавацілі ў шпіянажы на карысьць тае дзяржавы, якой яны ня прыймалі. Прытомнаму чалавеку навет прысьніцца не магло, што за навучаньне трэба будзе заплаціць жыцьцём.

# Польшча і XXI зьезд КПСС

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

чыцца асабліва сельска-гаспадарчай палітыкі. Параўнаўчая свабода, якой карыстаюцца польскія пісьменьнікі і журналістыя, і некаторыя бакі эканамічнай палітыкі таксама выклікалі супраць сябе гэтак званую «братэрскую» крытыку. Але польская камуністычная партыя ўвесь час дамагалася поўнай аўтаноміі ў нутраных пытаньнях і свайго права прыймаць самастойныя пастановы ў розных нутраных праблемах. Гэтым і тлумачыцца ськіваваная ўвага на тыя месцы прамовы Хрушчова, якія можна цытаваць у вабарону гэтага пагляду.

У Польшчы XX-ты зьезд КПСС і асабліва «сакрэтны даклад» Хрушчова аб злачынствах і памылках «сталінскай эры» заўсёды разглядаўся, як паваротны пункт у гісторыі камунізму. У Польшчы цьвердзілі, што XX-ты зьезд КПСС паклаў пачатак эпосе карэнных рэформаў, накіраваных на дэмакратызацыю камуністычнай сыстэмы. Хоць гэтая тэза ніколі не карысталася афіцыйным прызнаньнем паза Польшчай і ў некаторых заходніх камуністычных партыяў, Палякі ўпарта трымаюцца за яе, бо яна дае тэарэтычныя абгрунтаваньні польскіх рэформаў.

Вось чаму афіцыйная польская прэса зноў падкрэсьлівае, што XXI-шы зьезд дамагаўся прадаўжаньня «карэнных рэформаў, пачатых XX-ым зьездам, асабліва ў галіне пашырэньня сацыялістычнай дэмакратыі і ўмацаваньня сацыялістычнай законнасьці». Так, напрыклад, «Палітыка», поўафіцыйны ворган польскай кампартыі, у сваім камэнтары аб выніках XXI-га зьезду КПСС піша:

«XXI-шы зьезд КПСС даў новы імпульс да правядзеньня карэнных рэформаў, якія былі пачатыя пасьля гістарычнага XX-га зьезду ў галіне сацыялістычнай дэмакратыі й сацыялістычнай законнасьці, ня толькі ў Савецкім Саюзе, але таксама і ў іншых краінах, улучаючы Польшчу... Праз увесь даклад Хрушчова праходзіць думка аб далейшым разьвіцьці дэмакратычных прынцыпаў».

Гэты пункт гледжаньня, які можна знайсьці і ў іншых польскіх газэтах, надзвычай характэрны, таму што польскае камуністычнае кіраўніцтва мае намер прадаўжаць і пашыраць польскі экспэрымэнт лібэральнага камунізму.

**Р. В.**

ХОЧАШ ЗРАБІЦЬ СВАЙМУ БЛІЗКАМУ ПРЫЕМНАСЬЦЬ І АДНАЧАСНА КАРЫСЬЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ СПРАВЫ, ПАДАРУЙ ЯМУ КАМПЛЕКТ КНІЖАК ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

**АНДРЭЙ МАКАЁНАК**

# Каб людзі ня журыліся

Камэдыя ў 4-х актах

### ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

**Кавальчук** Цімафей Ягоравіч.
**Васіль** — ягоны сын.
**Самасееў.**
**Раман** — удавец.
**Юля** — ягоная дачка.
**Аксіньня** — удава.
**Маланка** — ейная дачка.
**Цярэшка** — пажылы калгасьнік.
**Гудзееў** — старшыня райпляну.
**Сенька-Заіка.**
**Ліхтароў** — бухгальтар калгасу.
**Дабрыла** — участковы міліцыянэр.
**Грачоў** — брыгадзір.
**Дзед.**
**1-шы калгасьнік.**
**2-гі калгасьнік.**
**3-ці калгасьнік.**

### АКТ ПЕРШЫ

Раньняя вясна. Із стрэхаў зьвісаюць сусолкі. Двор удавы Аксіньні. Насупраць відаць хата Рамана. З вуліцы на свой двор уваходзіць **Аксіньня.** Яна нясе ладную вязанку гальля. Ськінула вязанку на дрывотніку. Выпрастала натруджаную сьпіну.

**Аксіньня:** А каб вы струпянелі... (Пачынае секчы дровы.)

З хаты выходзіць **Кавальчук.**

**Кавальчук:** Даўненька я ня сек дровы.

**Аксіньня:** Можа, няёмка вам будзе перад людзьмі? Вы-ж госьць, дый не абы які — начальства. (Аддае яму тапор.)

**Кавальчук:** Нічога... (Сячэ дровы.)

Да варот падыходзіць брыгадзір **Грачоў.**

**Грачоў:** Аксіньня! Можа-б, ты пайшла да сьвірна насеньне чысьціць?

**Аксіньня:** Пайду тады, як каня дасі па дровы зьезьдзіць. А то, бачыш, на сваёй сьпіне цягаю зь лесу.

**Грачоў:** Старшыня забараніў перад пасяўной даваць коней па дровы.

**Аксіньня:** Ну дык хай сам чысьціць. Каб зь яго шлуньне вычысьціла... (Пайшла ў хату.)

Па вуліцы паўз вароты ідуць, абняўшыся, тры п'янаватыя **калгасьнікі.** Сярод іх **Сенька-Заіка.** Яны сьпяваюць.

Ой, расьцьвіла ружа белы цьвет,
Ой, расьцьвіла ружа белы цьвет.
Мела я мужа,
Ой, мужа я мела,
Мела я мужа — п'яніцу.

Спыняюцца ля варот, вітаюць брыгадзіра.

**Грачоў:** Што вы сабе думаеце, хлопцы? Пасяўная не за гарамі, а вы ў рабочы час казу водзіце па сяле.

**Сенька-Заіка:** А хто з нас к-ка-аза?

**Грачоў:** Дзе ваша сумленьне?

**Сенька-Заіка:** Ст-старшыні п-па-азычылі. У яго рэвізія выявіла недастачу сумленьня.

**Грачоў:** А ў вас лішкі? Значыць, ня пойдзеце на работу?

**1-шы калгасьнік:** Дык-жа ня з рукі нам. Ніхто ня йдзе. А мы што? Лысыя?

**Сенька-Заіка:** Баімся прамаргаць.

**1-шы калгасьнік:** Пойдзем на работу — абавязкова прамаргаем.

**Грачоў:** Што?

**Сенька-Заіка:** М-ма-агарыч.

**1-шы калгасьнік:** Старшыня збудаваў хату за наш кошт, за калгасны, а прадае і грошы ў кішэню. Сабе!

**Сенька-Заіка:** Дык нам-бы хоць м-магарыч дастаўся. П-пайшлі, хлопцы! (Засьпяваў.)

У нашым гародзе — вось бяда —
Самасеем вырасла лебяда.
І ніхто ня сеяў і сеяць ня думаў,
Прапалоць-бы трэба лебяду.

**Калгасьнікі пайшлі.**

**Грачоў** (да Кавальчука): Чулі?

**Кавальчук:** Чуў. Сур'ёзныя хлопцы.

**Грачоў** (зьдзівіўся): Якая-ж тут сур'ёзнасьць? Гэта-ж поўны разлад у калгасе.

**Кавальчук:** А вы што зрабілі? Вы-ж сакратар партарганізацыі.

**Грачук:** А што мы зробім? Былі ў райкоме цэлай дэлегацыяй, абяцалі прыняць меры.

**Кавальчук:** Так-та-ак... Усё чакаеце, пакуль зьверху прыедуць парадак наводзіць?.. А калі самі возьмецеся?

**Грачоў:** Тут старшыню мяняць трэба.

**Кавальчук:** Мяняйце.

**Грачоў:** Без райкому?

**Кавальчук:** А дзе-ж ваша ініцыятыва? Дзе-ж ваша партыйная прынцыповасьць, бальшавіцкая настойлівасьць? А?

**Грачоў:** Таварыш Кавальчук, памажыце нам. Вы ўсё-такі на высокай пасадзе ў Менску.

**Кавальчук:** Ідзеце й самі званеце ў райком, патрабуйце. А пасьля й я пазваню.

Грачоў пастаяў, а потым рашуча рушыў да праўленьня. Кавальчук ізноў узяўся за тапор. Да варот падыходзіць **дзед.**

**Дзед:** Памагай Бог!

**Кавальчук:** Дзякую, дзед. На Бога спадзявайся, а сам...

**Дзед:** Ды вам можна, а мне... Хіба толькі на Бога надзея.

**Кавальчук:** Што так?

**Дзед:** Стары я. Бяз сыноў застаўся. На вайне галовы паклалі. Сыноў маіх помніш?

**Кавальчук:** Як-жа! І Васіля помню, і Хведара, і Паўла, і Грышку.

**Дзед:** Ну вось. Кажуць, што ты цяпер начальнік вялікі...

**Кавальчук:** Ды як вам сказаць...

**Дзед:** Чуў... Людзі гаварылі. Дык вось, можа-б, ты старшыні нашаму сказаў. Хай-бы памог. Хата мая ўжо... Ды якая

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012



# Не адзін Кулакоўскі

## «КАБ ЛЮДЗІ НЯ ЖУРЫЛІСЯ» АНДРЭЯ МАКАЁНКА

Чытачы «Бацькаўшчыны» ў свой час былі шырака інфармаваныя аб тым шуме, які ў савецкай Беларусі быў падняты вакол аповесьці Аляксея Кулакоўскага «Дабрасельцы». Апрача войстрых прэсавых нападаў на аўтара, ня было ніводнай літаратурнай нарады, паседжаньня ці зьезду, уключна з XXIII партыйным зьездам, каб гэты твор ня быў асуджаны, як «ідэйна заганны» і «з мастацкага боку слабы». (Трэба ведаць, што паводля г. зв. сацыялістычнага рэалізму, калі дадзены твор разьмінаецца з партыйнымі дырэктывамі, ён мусіць быць абавязкава «слабым з мастацкага боку», хоць-бы ў свабодным, нявымушаным разуменьні літаратуры й мастацтва дадзены твор быў зь літаратурна-мастацкага гледзішча геніяльным). Дайшло да таго, што Кулакоўскі быў звольнены із становішча галоўнага рэдактара часапісу «Маладосьць», у якім гэтая аповесьць была надрукаваная, і змушаны быў публічна пакаяцца перад скліканай з гэтай нагоды спэцыяльнай сумеснай нарадай праўленьня Саюзу пісьменьнікаў БССР і ЦК камсамолу Беларусі, ды ўрачыста прыабяцаць грунтоўна пераапрацаваць твор згодна з партыйнымі вымаганьнямі.

Але яшчэ перад паяўленьнем «Дабрасельцаў» у 5-ым нудары «Маладосьці» за травень 1958 году, у лютаўскім 2-ім нумары часапісу «Полымя» была надрукаваная камэдыя Андрэя Макаёнка «Каб людзі ня журыліся». Тэмай абодвух твораў ёсьць жыцьцё калгаснай вёскі. Але гэтае жыцьцё й дзеючыя асобы ў вабодвых творах паказаныя не такімі, як вымагае г. зв. мэтад сацыялістычнага рэалізму ды якімі хацела-б іх бачыць партыя, але такімі, якімі яны ёсьць у запраўднасьці і якімі іх беспасярэдня назіралі абодвы аўтары. Дзеля гэтага й былі абодвы абвінавачаныя ў вадыходзе ад мэтаду сацыялістычнага рэалізму і ў пераходзе на рэвізіяністычныя пазыцыі.

Усё зло калгаснага жыцьця, незацікаўленасьць калгасьнікаў справамі зьненавіджанага імі калгасу, ухіляньне ад адбываньня калгаснага прыгону, матарыяльная галіта, беспарадкі й хаос у вядзеньні калгаснай гаспадаркі й арганізацыі працы, зладзейства, п'янства, самаволя й тупы бяздушны бюракратызм калгаснай і раённай адміністрацыі ды бездапаможнасьць ува ўсім гэтым калгаснага сялянства — у творы Макаёнка прадстаўлены ня менш ярка, пуката й праўдзіва, чымся ў творы Кулакоўскага. Тымчасам нагонка на Макаёнка была й ёсьць значна мякчэйшая й не такая частая, чымся на Кулакоўскага, ды і пачалася яна шмат пазьней, ня гледзячы на тое, што камэдыя Кулакоўскага паявілася тры месяцы раней за «Дабрасельцаў».

Сцэнічны паказ камэдыі «Каб людзі ня журыліся» ў тэатры імя Янкі Купалы меў адбыцца ў праграме сьвяткаваньня 40-ой гадавіны БССР. Аднак, пасьля пробнага паказу перад мастацкай радай тэатру, ён быў вычыркнуты з праграмы. Вось што асьветчыў у гэтай справе міністар культуры БССР Г. Кісялёў на рэспубліканскай нарадзе работнікаў культуры 6-га траўня 1958 г.:

«Нядаўна гэты калектыў (тэатру імя Янкі Купалы — С. К.) паказаў мастацкаму савету спэктакль па п'есе А. Макаёнка «Каб людзі ня журыліся» (рэжысэр Простаў)... спэктакль мае шмат істотных хібаў. У ім вельмі слаба адчуваецца, як наша партыя кіруе ўздымам калгаснай гаспадаркі. Спэктакль у такім выглядзе ня можа быць прыхільна прыняты сяньня нашым патрабавальным савецкім гледачом. Твор патрабуе больш выразнага і акрэсьленага вызначэньня яго ідэйнай накіраванасьці» («Літаратура і Мастацтва» за 7. 5. 1958 г.).

А вось прысуд, вынесены Макаёнку старшынём Саюзу пісьменьнікаў БССР П. Броўкам на 4-ым зьезьдзе пісьменьнікаў БССР 12 лютага сёлета:

«Яна (камэдыя «Каб людзі ня журыліся» — С. К.) дапрацоўвалася аўтарам. Але дагэтуль не пастаўленая, бо драматург так і ня здолеў па-сапраўднаму паказаць у сваёй п'есе жыцьцё, якім жыве сяньня наша вёска. Адмоўнае ў п'есе, відавочна, перавялічана. Асобныя факты, якія бясспрэчна былі ў жыцьці, паказаны ня так, як трэба. Уся бяда, што пафас п'есы зьвернуты на паказ перавялічэньня адмоўнага» («Літаратура і Мастацтва» за 13. 2. 1959 г.).

Менш войстрыя й радзейшыя напады на Макаёнка, чымся на Кулакоўскага, хіба, выясьніць можна галоўна тым, што ў «Дабрасельцах» на працягу ўсяго дзеяньня кальгасьнікі зьяўляюцца пасыўнымі, абыякавымі й бездапаможнымі перад калгаснай і сельсавецкай адміністрацыяй, зложанай з адных прайдзісьветаў, тады калі ў камэдыі «Каб людзі ня журыліся» змаганьне із злом вядзецца з самага пачатку акцыі. Падругое, у «Дабрасельцах» уся бяз выключэньня адміністрацыя калгасу й сельсавету — гэта людзі зусім адмоўныя, тады калі у творы Макаёнка ўсе адмоўныя рысы сканцэнтраваныя толькі на дзьвюх асобах: на старшыні калгасу Самасееву й на старшыні райпляну Гудзееву. Усе-ж астальныя — гэта людзі сумленныя, толькі, як сказана вышэй, зусім бездапаможныя, а таму пасыўныя, абыякавыя й апатычныя.

Але гэта зусім не памяншае зла, якое закаранілася ў калгасе й паказанае аўтарам з высокім мастацкім уменьнем і жыцьцёвай праўдзівасьцю. У творы, як на далані, паказана, што калгасьнікі, хоць-бы й хацелі, самі ня ў сілах наладзіць сваё жыцьцё, бо ўсякая ініцыятыва й пастанова мусіць выходзіць абавязкава ад партыйных ворганаў, якія да справы адносяцца пераважна бюракратычна й абыякава. Калгасьнікі навет ня могуць выбраць свайго старшыні, якога, як правіла, назначае, а найчасьцей прысылае аднекуль райком партыі. Калі-ж гэты старшыня аказваецца неадпаведным, дык яго звычайна пераводзяць у іншы калгас на тое самае становішча. Дык і Самасееў у камэдыі Макаёнка прызнаецца: «У вас я ўжо ў шостым калгасе за восем гадоў».

Калі прысланы райкомам кандыдат на новага старшыню калгасу Кавальчук радзіць старому калгасьніку камуністаму Цярэшку, што трэба гнаць вон Самасеева за ягоныя праступкі, Цярэшка адказвае: «Праганялі, і не аднаго ўжо. А з раёну другога прышлюць... Яшчэ лепшага».

На пацьверджаньне гэтых словаў тойжа Цярэшка пад адрысам старшыні райпляну Гудзеева кідае дакор:

«За чатыры гады вы ўжо чатырох ці пяцёх старшынь нам прывозілі і ўсіх хвалілі. А што потым аказалася?»

А аказалася тое, аб чым дапёк зь ірoніяй таму-ж Гудзееву іншы калгасьнік:

«Ня так даўно, перад Самасеевам, вы прывозілі нам старшыню. Помніце? Дзе ён цяпер? А быў чэсны. Бывала, злодзеям і жулікам праходу не даваў. Не-е! Навет міма калгасу не даваў прайсьці. Як заўважа каторага, тутжа ловіць, за руку ды сюды, у калгас, ды на пасаду кладаўшчыка ці касіра...»

Падобных цытатаў можна прывесьці цэлае мноства. Але даволі й гэтых, каб пабачыць, што калгас і калгасьнікі зьяўляюцца нешчасьлівай ахвярай самаволі ўсякіх прайдзісьветаў на становішчы старшыняў, што палажэньне калгасьнікаў зьяўляецца проста бязвыхадным, што на працягу толькі чатырох год райком прыслаў ім ужо пятага старшыню, а кажны зь іх быў варт адзін другога.

Змаганьне з Самасеевам вядзецца ня із собскай ініцыятывы калгасьнікаў, ды фактычна і наагул ня імі, бо, як кажа ўспомнены Цярэшка, калі «Даўбанеш яго, а табе скажуць: свайго глушануў». Змаганьне з Самасеевам вядзе фактычна толькі прысланы з райкому Кавальчук. Маса калгасьнікаў ня мае ніякага ўплыву на перамогу Кавальчука над Самасеевам, бо апошні ня імі а райкомам здымаецца із становішча старшыні, а на ягонае месца назначаецца Кавальчук.

Аб страшнай матарыяльнай галіце калгасу можа сьветчыць хоць-бы тое, што калгасьнікам собскага хлеба не хапае, і яны мусяць па хлеб у горад езьдзіць. А вось вымоўная сцэнка пры раскрытым капцы насеннай бульбы, перададзеная словамі калгасьніцы Аксіньні:

«Ну, расьцягнуць. Ня ўсю, дык палавіну. Перабіраем там, каля капцоў — наглядзелася. Кажная баба, на абед ідучы, у прыполе нясе, вечарам, з работы ідучы, таксама цягне. Не багата, штук дваццаць, ня болей. А колькі іх, а возчыкі? Глядзіш — і па пуду пад саломай каторы вязе. Разбагацее калгас, калі ўсе так цягаць станем? Хоцьбы хто прыкрыкнуў ці слова сказаў! Бязбацькаўшчына была, бязбацькаўшчына і ёсьць!»

І гэта ўжо пры новым старшыні калгасу Кавальчуку.

(Заканчэньне на 4-ай бач.)

# Сярод суродзічаў у Амэрыцы

(Заканчэньне з 2-ой бач.)

Сярод адзначаных ужо ў папярэдніх артыкулах дадатніх бакоў дзейнасьці нашых суродзічаў у Амэрыцы, неабходна адзначыць, паміж іншымі, адзін мамэнт вельмі адмоўны. Гэта амаль поўнае занядбаньне так важнае й патрэбнае з кажнага гледзішча выдавецкае дзейнасьці, перадусім амаль поўная адсутнасьць пэрыядычнае прэсы.

У свой час ньюёрская газэта «Беларус» выходзіла рэгулярна раз у месяц, а пазьней і цяпер выходзіць, як дакараў у вадным сваім фэльетоне К. Акула, рэгулярна раз на Каляды і раз на Вялікдзень. Калісьці выходзілі навуковыя часапісы — ворган Крывіцкага (Беларускага) Навуковага Т-ва Пр. Скарыны «Веда» і «Запісы» Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. Выходзіў, хоць няпэрыядычна, літаратурны часапіс «Конадні». Цяпер-жа ўсе гэтыя выданьні замерлі. Праўда, пацяшаючым зьявішчам ёсьць выхад добра зрэдагаванага першага нумару часапісу «Беларуская Моладзь», які, аднак, будучы сьціплы разьмерам і заплянаваны, як квартальнік, агульнай сытуацыі не зьмяняе.

Тымчасам патрэба наладжаньня пэрыядычных выданьняў тут вялізарная з падвойнага гледзішча: папершае, дзеля нутраных патрэбаў самой эміграцыі, галоўна з мэтаю самаабароны перад асыміляцыяй, падругое — дзеля вонкавай рэпрэзэнтацыі. У вадным з папярэдніх нашых артыкулаў гаварылася, што Нью Ёрк зьяўляецца палітычным цэнтрам усяе беларускае эміграцыі і вядзе найактыўнейшую палітычную й прапагандовую дзейнасьць навонкі. Але як-жа можна ўявіць беларускі палітычны эміграцыйны цэнтр і ягоную вонкавую палітычна-прапагандовую дзейнасьць бяз собскае і належна пастаўленае прэсы?

Праўда, галоўнай перашкодай фінансавыя цяжкасьці. Але калі ўзяць усю чыста новую беларускую эміграцыю ў Амэрыцы ўва ўсіх пунктах ейнага расьсяленьня ды параўнаць ейныя выдаткі на іншыя мэты з патрэбнымі выдаткамі на выдавецкую дзейнасьць, дык гэтыя фінансавыя цяжкасьці маглі-б быць лёгка пераможаныя. На мой пагляд, у Амэрыцы неабходна выдаваць адну тыднёвую палітычна-грамадзкую газэту, адзін літаратурны часапіс, адзін навуковы часапіс і выдаваць у большым разьмеры часапіс «Беларуская Моладзь». Патрэбна толькі ўмела й энэргічна арганізаваць гэтую справу й прыцягнуць да фінансаваньня яе ўсе беларускія асяродзьдзі ў Задзіночаных Штатах, а пажадана і ў Канадзе. Яшчэ раз хачу падчыркнуць з ноткай дакору, што выдавецкая справа, ня менш важная за ўсе іншыя, а за некаторыя й шмат важнейшая, нашымі суродзічамі ў Амэрыцы недаравальна занядбаная.

Як было адцемлена ў першым артыкуле гэтае сэрыі, Амэрыка, у сілу сваіх спэцыфічных асаблівасьцяў, вельмі хутка ўцягвае новапрыбылых у вір свайго жыцьця й хутка іх асымілюе. Гэта датычыць і Беларусаў, многа спасярод якіх, навет з новае эміграцыі, для беларускай нацыянальнай справы ўжо сяньня зьяўляюцца страчанымі. Калі ходзіць пра людзей старэйшага пакаленьня, дык у іх звычайна наступае псыхалягічная асыміляцыя. Моладзь-жа, асабліва малодшага веку, адначасна падпадае і псыхалягічнай і нацыянальнай асыміляцыі.

Прыкладам, на зборках Саюзу Беларускай Моладзі сябры старэйшыя паслугоўваюцца яшчэ беларускай мовай, затое малодшыя, у веку прыблізна да 20 гадоў, гутараць між сабой пераважна паангельску. Гэтыя апошнія належаць да беларускіх арганізацыяў і прыймаюць некаторы ўдзел у іхнай дзейнасьці пераважна не з матываў нацыянальных, але з таварыскіх, разглядаючы свой удзел у дадзенай арганізацыі й прысутнасьць на яе зборках, як таварыскую разрыўку.

Паколькі, аднак, Амэрыка, як ніякая іншая краіна ў сьвеце, спрыяе хуткай асыміляцыі, пастолькі, калі ходзіць пра Беларусаў, тут існуюць важныя перадумовы й да супрацьдзеяньня асыміляцыйнаму працэсу. Гэтымі перадумовамі ёсьць тое, што Беларусы жывуць тут пераважна буйнымі асяродзьдзямі, маюць магчымасьць із сабой стала кантактавацца й весьці арганізаваную нацыянальную дзейнасьць.

Побач з рознымі арганізацыямі й нацыянальна-культурнымі імпрэзамі, найважнейшымі дзейнікамі, якія найлепей могуць усьцерагчы ад поўнай асыміляцыі нашых суродзічаў у Амэрыцы, зьяўляецца нацыянальная царква, беларуская школа й друкаванае слова ў роднай мове. Вось чаму на пералічаныя тут фактары мусіць быць зьвернутая галоўная наша ўвага.

Трэба пры гэтым мець наўвеце, што абарона перад асыміляцыяй ня ёсьць у ніякім выпадку акцыяй, накіраванай супраць інтарэсаў Амэрыкі. Наадварот, тут кажны або амаль кажны культывуе ў сабе падвойны патрыятызм: як амэрыканскі грамадзянін ён пачуваецца патрыётам Амэрыкі, а як прыналежны да дадзенае нацыянальнасьці сваім паходжаньнем, ён зьяўляецца нармальна патрыётам таго народу й тае краіны, зь якіх выйшаў. Людзей, што прыдзержваюцца такога прынцыпу, высака цэняць і Амэрыканцы, якія зьяўляюцца імі ўжо ад некалькіх пакаленьняў. Яны любяць часта паўтараць, што дрэнны Амэрыканец з таго чалавека, які ня ёсьць патрыётам краіны свайго паходжаньня.

Канчаючы гэтае апісаньне маіх уражаньняў і спасьцярогаў аб нашых суродзічах у Амэрыцы, хачу згары перапрасіць іх за магчымыя недакладнасьці, а мо' й няправільнае асьвятленьне тых ці іншых зьяваў зь іхнага жыцьця. Таму я быў-бы шчыра ўдзячны тым нашым «новым Амэрыканцам», але адначасна і беларускім патрыётам, якія-б на бачынах наступных нумароў «Бацькаўшчыны» ўдакладнілі й папоўнілі мае спасьцярогі. Сам-жа асабіста пастараюся таксама дакладней і падрабней пазнаёміць чытачоў «Бацькаўшчыны» з жыцьцём і дзейнасьцю нашых суродзічаў у Амэрыцы ўжо пасьля таго, калі ўдасца адведаць іх наступным разам.

**Ст. Станкевіч**

---

там хата!.. Сам ведаеш — старому цяпло трэба. Я яшчэ сяк-так, а старая ўжо... мерзьне. Шкада яе.

**Кавальчук:** Колькі табе гадоў, дзед?

**Дзед:** А во на Пятра будзе семдзесяць шэсьць. Я дык прывык. Каторы год вартаўніком — прывык. А яна.. старая ўжо...

**Кавальчук:** Добра, дзед, пагавару.

**Дзед:** Можа, цябе паслухае... Прасіў, каторыя з раёну прыяжджалі, ня слухае ён іх. Ну, дзякую. Дык я пайду. Старая адна там... Занядужала. (Адышоўся крыху.) І Паўла помніш?.. Харошы хлопец быў... (Уздыхнуў.) І ажаніцца не пасьпеў. (Пайшоў).

Прыбягае **Маланка.**

**Маланка:** Цімафей Ягоравіч! З райкому звоняць. Вас просяць.

**Кавальчук:** Хто звоніць?

**Маланка:** Сам сакратар.

**Кавальчук:** Ну, калі сам, дык я бягом... (не сьпяшаючыся паклаў тапор і паволі пайшоў у сельсавет.)

На вуліцы паказалася **Юля.**

**Юля:** Маланка! (Паказвае паўлітра, пакручваючы ў руцэ.) (Пстрыкнула сабе па горле.)

**Маланка:** Што гэта?

**Юля:** Даведка.

**Маланка:** Якая даведка?

**Юля:** Што мяне адпускаюць з калгасу.

**Маланка:** Выпрасіла ўсё-такі ў старшыні?

**Юля:** Бацька ўгаварыў. Старшыня спачатку муліўся, а потым кажа, што пячатка ў яго сухая. От — спырсьнем зараз і... (Стукнула паўлітэркай па далоні, нібы пячатку паставіла.)

Із сваёй хаты выходзіць **Раман.**

**Раман:** Юлька! Марш дамоў!

Юля паслухмяна пайшла да хаты. З хаты выходзіць Аксіньня па дровы.

**Маланка:** Юльку Раманаву адпускаюць з калгасу...

**Аксіньня:** Ну дык што?

**Маланка** (з папрокам): І мы маглі-б так зрабіць.

**Аксіньня:** Як?

**Маланка:** Падсунулі-б паўлітра самагонкі, выжлукціў-бы й адпусьціў.

**Аксіньня:** А смалы ён не хацеў? А трасцы, а скульля яму ў бок!

**Маланка:** Ну й тут я сядзець ня буду! Ня хочаш дабром — кіну ўсё й паеду ў горад. (Крута павярнулася й пайшла з двара.)

Аксіньня бярэ тапор і пачынае секчы дровы. Цюкае тупіцай па палцы, але тая не паддаецца. Тады Аксіньня кідае тапор і на калена — хрась. Ізноў пачынае секчы. Ды неяк няёмка паклала палку, ударыла тапаром, і палка паляцела аж за вароты, якраз тады, калі да варот падыйшоў п'янаваты Самасееў.

**Самасееў:** Аксіньня!

**Аксіньня:** Га!

**Самасееў:** «Га»... Падыйдзі-тка сюды. (Кіўком пальца падзывае яе да варот.) Што гэта ў цябе за гусь такі?

**Аксіньня** (азірнулася): Дзе? Які гусь?

**Самасееў:** Ня прытварайся! У каракулях ходзіць. Што гэта за пэрсона?

**Аксіньня:** А-а, гэта прымак. А ты думаў, старшыня, што я й зьвякую ўдавой?

**Самасееў:** Ну, ты мяне не абувай у лапці. Хто ён?

**Аксіньня** (гульліва): Няўжо прыраўнаваў, старшыня? Га? У цябе-ж свая жонка, дзеці дарослыя.

**Самасееў** (перапыняе): Ну, вось што, скажаш яму, каб зайшоў у праўленьне, там пагавару.

**Аксіньня** (памяркоўна): Ты сяньня, старшыня, на ўзводзе, падвыпіўшы. А можа, ён якое начальства, можа, у камандзіроўку прыехаў...

**Самасееў** (рашуча): Калі ў камандзіроўку, дык хай зьявіцца куды трэба й па ўсёй форме: так і так, прыбыў і — камандзіроўку на стол. А то каторы дзень ходзіць, выпытвае, вынюхвае, як рэвізор які.

**Аксіньня:** А няўжо ты рэвізораў баішся?

**Самасееў** (прапусьціў міма вушэй): Нечага мне тут людзей баламуціць! Можа, ён цёмная фігура, амнісьціраваны якінебудзь.

**Аксіньня:** Што ты гаворыш старшыня? Яго тут, бадай, усе ведаюць, свой чалавек. Гэта-ж ён наш калгас арганізаваў і першым старшынём быў. Дваццаціпяцітысячнікам яго прыслалі тады. А ты кажаш — амнісьціраваны. Яшчэ з маім мужыком дружыў... Вось і прыехаў пагасьцяваць, паглядзець, як мы тут жывем.

**Самасееў:** Пагасьцяваць? Дык хай п'е самагонку і — на ўсе чатыры. А то правяральшчык!..

**Аксіньня:** Можа цяпер у яго пасада такая...

**Самасееў:** Якая?

**Аксіньня:** Кантроль, можа. Вось ён і ходзіць па калгасе, зь людзьмі гутарыць, а потым увесь вечар сядзіць і піша.

**Самасееў** (перадражнівае): «Пі-іша»... (Насьцеражыўся.) Піша, кажаш?

**Аксіньня:** Піша й піша. І кажны дзень адсылае ў Менск во такія пакеты.

**Самасееў:** Гм... А што піша? Не папыталася?

**Аксіньня:** А хто яго ведае. Можа, тое, што ў людзей выпытвае.

**Самасееў:** Гм... І ў цябе выпытваў што?

**Аксіньня:** Пытаўся пра сёе-тое.

**Самасееў:** Ну?

**Аксіння** (сэкрэтна): Пра карову, колькі малака дае, чым кармлю...

**Самасееў** (аж раззлаваўся): Напляваць мне на тваю карову.

**Аксіньня** (як-бы здагадалася): І пра цябе пытаўся.

**Самасееў:** Ну-у?!

**Аксіньня** (набіраючы ў фартух палак): Лішняга нічога не сказала.

**Самасееў** (адбірае з рук палкі й кідае): А - ат!.. Пра што пытаўся, што сказала?

**Аксіньня:** Пахваліла я цябе, старшыня. За што трэба й за што ня трэба хваліла.

**Самасееў** (недавярае): Ой, брэшаш...

**Аксіньня:** Каб я з гэтага месца ня зыйшла.

**Самасееў:** Ну-ну!..

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012

© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012



# Не адзін Кулакоўскі

(Заканчэньне на 3-яй бач.)

Многа гаворыць і фінал твору. Злоўленага пры такой-жа пакражы бульбы, якая апісаная вышэй, калгасьніка Рамана новы старшыня калгасу садзіць у турму. Пры чым, Раман увесь час прадстаўлены аўтарам, як тып пазытыўны. Ня гледзячы на гэта, ён не набраў перакананьня да «сацыялістычнай законнасьці», не перaўзгадаваўся, ня прызнаў сваей «памылкі», бо бульбу «бралі ўсе», а першы раз спаткаўшы старшыню пасьля выхаду з турмы, кідаецца на яго, хапае загрудкі ды выказвае злосныя словы пагрозаў. Гэтак, далёка не аптымістычна, заканчваецца п'еса.

Дзеля цэласьці малюнку неабходна сказаць некалькі словаў і аб прадстаўніку раённых уладаў — аб старшыні райпляну Гудзееву. Ён паказаны тыповым савецкім бюракратам, для якога вызначаны для калгасу плян, паказчыкі, зводкі, лічбы — гэта найвышэйшы закон, хоць-бы пад гэтымі зводкамі й лічбамі ніякага ня было зьместу.

«Па пляну трэба пасеяць сто гэктараў кукурузы, — дакарае Кавальчука Гудзееў. — А пасеяна?.. Глядзі... А што такое сяньня кукуруза? На толькі эканамічная, але і палітычная культура. Адразу відаць, што старшыня гэта недаацэньвае, бо ня ведае палітыкі партыі на сяньняшні дзень».

Савецкая крытыка й партыйныя дзейнікі закідаюць Макаёнку, што ён ненатуральна згусьціў чорныя хварбы, малюючы жыцьцё калгаснай вёскі, і тым самым хвальшыва прадставіў савецкую запраўднасьць. Аўтару закідаецца, што ён, быццам паміма сваей волі, зрабіў палітычную памылку, захапіўшыся толькі адмоўным, а ня бачучы «здаровага, сьветлага, што павінна сцьвярджацца і ў імя чаго робіцца адмаўленьне», як цьвердзіць крытык Ул. Юрэвіч («Літаратура і Мастацтва» за 21. 8. 1958 г.).

Але ёсьць усе падставы цьвердзіць, што Макаёнак зусім ня згушчаў чорных хварбаў, як і не зрабіў ніякіх памылак, а пісаў з поўнай сьведамасьцю й перакананьнем, што абняты творам адрэзак калгаснага жыцьця паказаны ім правільна і згодна із запраўднасьцю. Ды ня толькі з поўнай сьведамасьцю й перакананьнем пісаў, але, як сталася нядаўна ведамым, з такой-жа сьведамасьцю яшчэ й да сяньня бароніць занятае ім становішча. Бо калі Кулакоўскі пад ударам зьядлівае крытыкі быў змушаны зыйсьці із занятай ім творчай пазыцыі, пакаяцца й прызнаць нязробленыя ім «памылкі», дык Макаёнак астаўся пры сваіх перакананьнях. Гэтак першы сакратар ЦК камуністычнай партыі Беларусі К. Мазураў, выступаючы на 4-ым зьезьдзе пісьменьнікаў БССР, быў змушаны адцеміць наступнае:

«Не ўдалася ў Макаёнка новая п'еса «Каб людзі ня журыліся». Гэты твор мае таксама сур'ёзныя недахопы. Нажаль, ні Кулакоўскі, ні Макаёнак ня выступілі на зьезьдзе. Мне ведама, што т. Кулакоўскі працуе цяпер над творам аб будаўнікох Старобінскага калійнага камбінату. Гэта вельмі добра. Значыцца, ён зрабіў вывады з крытыкі, правільна зразумеў сваю памылку і хоча яе направіць. Кажуць, што т. Макаёнак нэрвозна ўспрыняў крытыку яго п'есы. Нас непакоіць ня стольkі тое, што некаторыя маладыя пісьменьнікі робяць асобныя памылкі, а тое, што часамі няправільна адносяцца да крытыкі» («Советская Белоруссия» за 14. 2. 1959 г.).

Гісторыя з Макаёнкам і Кулакоўскім найлепей паказвае, да якой ступені зьяўляецца пад камуністычнай дыктатурай скаваная творчая думка пісьменьніка. Але, з другога боку, яна ня менш сьветчыць і аб тым, што больш прынцыповыя пісьменьнікі ўсё-ж бунтуюцца супраць духоваго нявольніцтва й ілжы, якую ім дыктуе г. зв. сацыялістычны рэалізм, і хоць часамі ды хоць часткова намагаюцца паказаць жыцьцё й людзей такімі, якімі яны ў запраўднасьці ёсьць.

**Ст. Крушыніч**

# Зь беларускага жыцьця

### ГАДАВЫ СХОД КАСЫ САМАПОМАЧЫ ПРЫ ЗГУРТАВАНЬНІ БЕЛАРУСАЎ КАНАДЫ

У нядзелю 7-га лютага сёлета адбыўся ў Таронта Гадавы Сход сяброў Касы Самапомачы. Із справаздачы скарбніка й іншых сяброў Управы й Крэдытавага Камітэту вынікала, што Каса ўсьцяж расьце як у сяброх так і ў вабаротах. У мінулым годзе абарот Касы быў 114,066 дал. 14 ц. Ён на 12 000 перавысіў абарот з 1957 году. Выдана было сямнаццаць пазычак на суму 21 387 дал. Найменшая пазычка была 150 дал. найбольшая — 3.500 дал.

На ўклады й ашчаднасьці атрымана было 1.694 дал. 61 ц. працэнтаў. На ўклады было выплачана сябром Касы па 5%, а на ашчаднасьці — 3½%, г. зн. працэнты шмат вышэйшыя, чымся плацяць мясцовыя банкі. За пазыкі было брана па 10%, калі ніжэй тысычы даляраў і 8%, калі вышэй тысячы даляраў, з адлічэньнем працэнтаў паступовым, г. зн. із зьмяншэньнем сумы залегласьцяў прапарцыянальна зьмяншаліся й працэнты.

Зьезд адлажыў на гаранцыйны фонд Касы 195 дал. 50 ц. Гэткім чынам цяпер у гаранцыйным фондзе Касы (сталым капітале) ёсьць ужо 718 дал. 31 ц. У адукацыйным фондзе ёсьць 141 дал.

У мінулым годзе ня было адмоўлена пазычкі ніводнаму апліканту. Былі два выпадкі, што людзі не хацелі рэгулярна сплачваць пазычак і трэба было на дапамогу паклікаць адваката. Гэта ў большых пазычковых касах зьявішча нармальнае, а ў нас здарылася ўпяршыню.

Із справаздачаў вынікала, што ўсе ворганы Касы працавалі добра. Кантрольная Камісія Касы сьцьвердзіла, што ўсе кніжкі былі ведзены добра, прыходы й расходы згаджаліся. Дырэкцыі, Крэдытоваму Камітэту і Кантрольнай Камісіі Сход злажыў падзяку за добрую працу.

Г. зв. неразьдзеленыя даходы Касы (каля 40 дал.), г. зн. тыя, што асталіся пасьля сплаты працэнтаў на ашчаднасьці й удзелы, Сход пастанавіў ахвяраваць на куплю царквы Сьв. Кірылы Тураўскага.

Сход закончыўся супольнай вячэрай.

**М. К-р**

### НА СЬВЯТКАВАНЬНІ Ў УКРАІНЦАЎ

На сёлетнім урачыстым сьвяткаваньні Украінскага нацыянальнага сьвята 41-х угодкаў абвешчаньня Незалежнасьці й 40-х угодкаў Саборнасьці Украіны 22 студзеня 1918 г. бралі ўдзел, на запросіны Камітэту Сьвяткаваньня, прадстаўнікі Галоўнае управы ЗБК, сп сп. Г. Барановіч і М. Арцюх. Сьвяткаваньне адбылося ў Таронта ў нядзелю 1-га лютага.

### ГАДАВЫ СХОД ТАРОНЦКАГА АДДЗЕЛУ ЗБК

Сёлетні гадавы сход Таронцкага аддзелу Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе адбыўся ў сьвятліцы Беларускага Дому ў нядзелю 15-га лютага. Сход прайшоў у сяброўскай атмасфэры, дзе паважна было абмеркавана ня зусім выразнае пытаньне патрэбы выбару мясцовай управы аддзелу, з мэтаю аблягчэньня працы Галоўнае Управы ЗБК, якое было, у парадку прапанoваў і контрапрапанoваў, вырашана пазытыўна. Папярэдняя Управа ў складзе сп. сп. Н. Сільвановіча, М. Кулеша й Я. Мышкоўскага, ня гледзячы на некаторыя недахопы ў прошлым, засталася ў поўным складзе й на наступную кадэнцыю, абяцаючы актыўней падыйсьці да грамадзкай працы. Адказнасьць за Беларускі Дом была перанесена на старшыню ўправы аддзелу сп. Сільвановіча, як і функцыі Гаспадара Дому.

**А. -віч**

### ДР. А. ВЯРБІЦКІ АТРЫМОЎВАЕ НОВАЕ НАЗНАЧЭНЬНЕ

Выдаваная ў Ватэрлё, штат Айёва, газэта «Кур'ер» паведаміла 14 студзеня, што др. Аўген Вярбіцкі, дасьледнік-біяхэмік, прызначаны за сябру рэдкалегіі амэрыканскага навуковага часапісу «Фуд Рысэрч». Газэта «Кур'ер» піша: «Др. А. Вярбіцкі, кіраўнік дасьледніцкае групы ў Рат Пакінг Компаны, будзе рэцэнзаваць прафэсійныя выданьні ў сваёй галіне й дараджваць часапісу «Фуд Рысэрч» у выдавецкіх справах. Др. А. Вярбіцкі супрацоўнічае таксама (як «абстрактэр») з пэрыядычным навуковым выданьнем 'Чэмікл Абстрактс'».

### ПРЫХАДЖАНЕ ЎШАНОЎВАЮЦЬ ПРАЦУ СП. М. ТУЛЕЙКІ

15 лютага сёлета ў залі Беларускага грамадзкага цэнтру ў Брукліне расстаўленыя белыя сталы літарай «Т» абазначалі «Тулейку», сп. Міхася Тулейку, арганізатара й рэгента хору катэдральнага сабору Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку. Каб ушанаваць вялізарную працу, укладзеную сп. Тулейкам і харыстымі ў арганізацыю ньюёркаўскага прыходу БАПЦ, царкоўная рада (старшыня сп. Я. Казьлякоўскі) наладзіла бясёду свайму рэгенту. Урачыстасьць ушанавалі сваім прыбыцьцём Яго Высокапрэасьвяшчэнства Ўладыка Васіль, Высокапрэпадобны мітрафорны пратаярэй а. Хвёдар Данілюк і а. Робэрт Ван Каўэлярт. Усіх удзельнікаў было каля 60. Апрача прыгожых і шчырых словаў падзякі (каму ня відавочныя вынікі высілку сп. Тулейкі!), удзячныя прыхаджане дарычылі рэгенту таксама падарунак. Жанчыны частавалі песьняй. А Бог хай заплаціць яму й харыстам добрым здароўем.

**Я. З.**

## Св. Пам. Мікола Дубяга

Дня 10 лютага 1959 году памёр неспадзявана ў Нью-Брансвіку ў веку 61 год сьв. пам. Мікола Дубяга. Нябожчык паходзіў з Крывіцкага раёну, Вялейшчына. Асіраціў жонку ,сына й унукаў. Паховіны адбыліся ў сыботу 14 лютага ў Саўт-Рывэры, дзе нябожчык стала пражываў. На апошняе разьвітаньне сабралося столькі народу, што рэдка бывае.

Сьв. пам. Мікола Дубяга адзначаўся рэдкімі ў наш час уласьцівасьцямі характару: спакоем, зраўнаважанасьцяй, ветлівасьцяй і дабратой. Ніколі нікога ня скрыўдзіў.

Паніхіду па нябожчыку служылі япіскап і трох сьвятароў. На апошняй Службе ў царкве сьв. Пятра й Паўлы ў Саўт-Рывэр прыгожае разьвітальнае слова сказаў а. пратаярэй І. Жарскі, сваяк пакойніка.

Сьв. пам. Мікола Дубяга належаў да С.-Рывэрскага аддзелу БАЗА й парахвіі БАПЦ у Нью-Брансвіку. Лятуценьнем ягоным было вярнуцца на вольную Бацькаўшчыну і злажыць сваe косьці у роднай зямельцы. Ня суджана было. Няхай-жа пухам яму будзе гасьцінная амэрыканская зямля.

**Стары Сябра**

### ПОШУКІ

Ветліва прашу ўсіх суродзічаў, хто знае што-колечы аб лёсе Паўлюка Бяляева з Грускова спад Снова, былога падахвіцэра 13 Б. баталёну, паведаміць на адрас:

V. Zdan
125, Ave. Clermont
Montreal, 14, P. A., Canada.

✳

**Цыба** Марфа шукае свайго мужа **Цыбу** Сьцяпана. Весткі просіцца слаць на адрас ейнага брата:

Mr. Walter Tell
1023 Ridge Ave.,
Rockford,Ill., U S A

### АД АДМІНІСТРАЦЫІ

**Паведамляем яшчэ раз, што грошы за кніжку Я. Станкевіча «Зь гісторыі Беларусі» трэба слаць на наступны адрас аўтара:**

**J. Stankevich, c/o Fr. Skoryna Society, 6 Vandervoort Place, Brooklyn 37, N. Y., USA.**

# Як жывецца ў Аўстраліі

Былых г. зв. «ДэПі» пражывае ў Аўстраліі каля 400 тысяч, з чаго Беларусаў — каля 6 тысяч. Беларусы расьсяліліся пераважна ўва ўсходняй і паўдзённай Аўстраліі, дзе клімат больш зносны.

Найбольш нашых суродзічаў прыбыло сюды ў 1949 годзе. Заработкі былі тады ў сярэднім 7 з паловай фунтаў для мужчын і 6 фунтаў для жанчын. Калі ў сям'і было трое дзяцей, а працаваў толькі галава сям'і, дык заашчадзіць больш за аднаго фунта ў тыдзень было цяжка. Пляцы-ж пад дамы ў тым часе каштавалі па 80 фунтаў. Але так як гэтыя пляцы можна было браць на раты, дык некаторыя рабілі проста: за 5 фунтаў задатку бралі пляц, ставілі палатку або які гараж, уводзілі ваду й электрыку й сядзелі ўжо на сваім. Не патрабавалі ўжо за памешканьне плаціць 3—4 фунты, а за ашчаджаныя, такім чынам, грошы куплялі матар'ял на дом. Хто так пачынаў, то хоць меў спачатку нявыгады, але затое хутка стаў на ногі.

Тыя, што мелі шмат малых дзяцей, заставаліся пераважна ў дзяржаўных лягерох, дзе за паўтара фунта ў тыдзень атрымоўвалі два пакоі з вадой і электрыкай.

Калі ў першых 4—5 гадох паўстала шмат гаражоў і паўхат, дзе жылі нашыя людзі, дык сяньня ўжо там павырасталі фібравыя, а то й мураваныя выгадныя дамы. Свае-ж былыя гаражы адпушчаюць ужо Немцам, якія едуць сюды масава. Спрыт і зараднасьць нашых людзей зьдзіўляе Аўстралійцаў. Шматлікія ўжо пабудавалі й прадалі з заработкам сваю хату, ды за новую ўзяліся. Словам — вольная краіна, вольная ўсім дарога, кажны працуе для сябе.

Для моладзі тут запраўды дарога. Навука ў пачатковых і сярэдніх школах дармовая, шмат ёсьць розных прафэсіянальных школаў, куды запрашаюць ісьці вучыцца. Калі хто згаджаецца працаваць у якой-небудзь фірме, дык яна такога вучня вучыць на свой кошт ад 13 гадоў жыцьця. Матурыстыя тут — на расхват. Ініцыятыўны чалавек імкнецца тут сам ці на супалку зь іншымі арганізаваць якоесь прадпрыемства ці хвабрыку.

✳

Пару тыдняў таму меў я цікавую гутарку із сп-няй Алёнай Сівоха, 44 гады, зь Віцебшчыны.

— Ну што-ж, — расказвала яна, — як прыехалі мы перад Усімі Сьвятымі ў 1949 годзе сюды ў Аўстралію, дык тут духата была немагчымая. А як прыйшлі Каляды — дык мы толькі ваду пілі ды ляжалі, а мой Андрэй — дык із халоднай ванны не хацеў вылазіць. Нам было цяжка: трое дзяцей — найстарэйшаму 13 год — ды старая маці. Хоць ты што хочаш рабі...

— Ну, і што-ж вы рабілі? — пытаю.

— Андрэй дастаў быў працу ў хвабрыцы цьвікоў, а мы сядзелі сьпярша ў лягеры. Далі нам два пакойчыкі з кухняй і з усім што трэба. Плацілі за гэта 30 шылінгаў у тыдзень (паўтара фунта). Так грошы разыходзіліся на ўсё, што толькі зь 10 шылінгаў маглі заашчадзіць. Але неяк дзеці пайшлі ў школу, дык яшчэ за іх нам даплочвалі 5 фунтаў у месяц. Я пайшла працаваць у кухню ды стала зарабляць мала што менш за майго мужа, бо ў сыботы мне плацілі на 50% больш, а часам мела працу і ў нядзелю, калі плацілі на 100% больш. А далей і наша мама стала даглядаць іншых дзяцей, чые маткі працавалі. І вось нанясуць ей гэтых крыкуноў часам чатыры або й пяць, а па фунту з кажнага, дык і мама мае ў пятніцу 5 фунтаў. Так сталі мы аглядацца самі каля сябе, купілі вопратку, радыё, машыну да шыцьця, кухонную пасуду. А тады мой кажа: «Давай, Алёна, на вашы бабскія грошы жыць, а мае будзем у банк складаць». І я кажу — давай. Складаем мы ўжо неяк па 9 фунтаў у тыдзень у банк і даволі цяжка нам пражыць на мае грошы, аднак маці памагае, па пару фунтаў нам дае, дзяцей глядзіць, у школу выпраўляе ды яшчэ курэй разьвяла, было іх нешта з 20. Аж яйкі надаелі, перарэзалі бальшыню курэй, а пакінулі толькі 7 і аднаго пеўня.

— А тады што? — пытаю.

— А неяк пад канец 50-га году ў нас было ў банку больш за 400 фунтаў. Я кажу — дамо задатак на хату, а мой з мамай упёрліся — купім лепш малую гародную фарму. Я з гэтага ўсяго сама ня ведаю — ці знарвавалася ці ўзлавалася, бо аж спаць перастала. А тут яшчэ сын старэйшы — Янук — так стаў буяніць, што сорамна было настаўніка спаткаць. Адзін раз паліцыянтка прывяла яго дадому й сказала, каб яго ня пушчалі хадзіць самапасам. Ну, але ў канцы майго старога нагаварылі агенты ўзяць на выплату хутар каля двух з паловай гэктараў, недалёка ад Сыднэю й 10 мінут пехатой ад станцыі Сэвэн Гіл. І я падумала, падумала, хоць і подаляка, і на адзіноце, але ўсё-ж лепш мець свой кусочак зямлі. Паехалі мы ўсёй сям'ёй глядзець «фарму», а на ёй стаіць апушчаная маленькая хатка, але з вадой і электрыкай ды ладны пахілы кусок зямлі, парослы да поясу, дзе-ня-дзе па кусту хмызьняку й пару эўкаліптаў. Ціха тут і спакойна, толькі час-ад-часу пераклікаюцца кукабуры й дзікія галубы. Мы — бах! далі задатак і за тры месяцы перанесьліся ў ліхую хацінку, але сваю. Мой як узяўся чысьціць хутар ад травы й сьмяцьця, як узяўся капаць вечарамі й пры сьвятах, што аж людзі сьмяяліся. Чаму гэта, кажуць, капае, а ня трактарам?

— А як-жа далей, — пытаю.

— Дык-жа вось. Нехта параіў нам курэй разьвесьці. І купілі мы 200 куранят за 10 фунтаў. Гадуем мы іх — гадуем, а яны ўсё дохнуць і дохнуць. Ну вядома — ня мелі практыкі ў курах. Але неяк пад 150 засталося. Ды што-ж, калі пачалі нясьціся — яйкі спалі на цане: 5 шылінгаў тузін, а корм вельмі дарагі. Біліся, мы біліся — ніякага толку — амаль усіх курэй прадалі, пакінулі толькі зь дзесятак. І добра зрабілі.

— Але-ж вы працавалі й на хвабрыцы?

— Цяпер із старым мы ўжо стала працавалі, але жыць нам стала лягчэй: свая гародніна, якая тут так дарагая. У нас, дзе мой капаўся, нарасло столькі таматаў, столькі гуркоў і капусты, што людзям дарма раздавалі. Але што мы сталі прадаваць — дык гэта бульбу. Аўстралійцы прыяжджаюць аўтамі й крычаць: «Гало, фрэш потэйтос!» Тут мой стары й кажа — давай, усю зямлю засадзім бульбай. Нанялі мы за 5 фунтаў трактар, ён нам за паўдня загараў і забаранаваў увесь гарод, а мы давай садзіць бульбу. Як урадзіла — дык мы азалаціліся. Проста кірмаш зрабіўся на бульбу: мы выбралі за яе больш за 300 фунтаў. На другі год ужо так бульба не ўрадзіла, бо трэба было даць гною, дык мой стары пачаў заводзіць сьвіньней, маем іх сяньня 30 штук.

— І як-жа сяньня жывецца?

— Сын кінуў усе школы й пайшоў у хвабрыку фанеры, і за два гады там яго зрабілі форэманам, сяньня ўжо ажаніўся зь нейкай Аўстралійкай і выйшаў з хаты. Шкада хлапца, малады, мог із сваёй ажаніцца й жыць разам. Ну — дочкі падрастаюць. Цяпер ужо мы маем новы фібравы домік з усім што трэба, мелі радыё, а цяпер купілі тэлевізію, і стары мой купіў трактар ды цяпер ня толькі свой гарод гарэ, але й езьдзіць па людзях і добра зарабляе. Мы ўжо даўно выплацілі фарму й пару сот фунтаў маем у банку.

— Ну, а дзеці вашы ўмеюць пабеларуску?

— Яны ўмеюць пабеларуску, але між сабой гавораць паангельску. Мы ўжо й сварыліся, але нічога ня можам зрабіць.

— А ці думаеце ў будучыні вярнуцца дадому?

— А родненькі мой, дужа цяжка адказаць. Мой заўсёды кажа: «Паехаў-бы дамоў», але ўжо абжыліся тут, загаспадараваліся.

Гутарка наша закончылася. І мы бачым, што час робіць сваё: заціраецца ўспамін роднае хаты, якую ўжо бальшавікі пасьпелі разбурыць, чалавек урастае ў чужое асяродзьдзе, а дзеці зусім зьліваюцца з чужым краем.

Аўстралія, 1. 1. 1959. **Я. Лаўрыновіч**

## Адказы Рэдакцыі

**Сп. А. М. (Таронта, Канада):** Ваш адрас перадалі ў экспэдыцыю прошанага Вамі часапісу. Што да кнігі „Kleine Slawische Biographie“, дык яе можна выпісаць з наступнага выдавецтва: Otto Harrassowitz, Verlag, Wiesbaden, Taunusstr. 5.

Прысланую фатаграфію зьмясьціць, на жаль, ня можам — запозна.

**Сп. Ё. Д. (Квібэк, Канада):** Просьбу Вашу што да «Беларускага Зборніка» паладзілі. У іншых справах зьвяртайцеся на наступны адрас:

Byelorussian Alliance in Canada
1000 Dundas St. W.,
Toronto 3, Ont., Canada


## НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

**АНГЕЛЬШЧЫНА:**
**Mr. Aleksander Laszuk**, 97 Moore Park Rd., London, S. W. 6.
**АРГЕНТЫНА:**
**Asociacion Bielorusa en la Argentina**, Calle Coronel Sayos 2877, Valentin Alsina, p-cia Buenos Aires.
**АЎСТРАЛІЯ:**
**Mr. A. Vasilenia**, 39 Edwin St., Croydon, N. S. W.
**Mr. A. Maroz**, 109 Morrison Rd., Midland Junction, W. A.
**Mr. M. Nikan**, 14 Steel St., Spotswood—Melbourne, Vic.
**Mr. W. Akavity**, 80 Tapley Hill Rd., Royal Park, S. A.
**БРАЗЫЛІЯ:**
**Mr. C. Cimafiejčyk**, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba — Parana.
**ЗАДЗІНОЧАНЫЯ ШТАТЫ:**
**Mrs. L. Bielenis**, 2042 W. St. Paul Ave., Chicago 47, Ill.
**Mr. B. Danilovich**, 303 Howard St., New Brunswick, N. J.
**Mr. Ul. Duniec**, 814 Brayton Ave., Cleveland 13, Ohio.
**КАНАДА:**
**Mr. K. Akula**, 57 Riverdale Ave., Toronto, Ont.
**ФРАНЦЫЯ:**
**Union des Travailleurs Biélorussiens en France**, 26, rue de Montholon, Paris 9.
**Mr. W. Kasztelan**, 33 rue Kleber, Mouvaux (Nord).

БАЦЬКАЎШЧЫНА

**Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.**

**Выдавец: Уладзімер Бортнік**

**РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды Рэдакцыі. Незамоўленыя рукапісы назад не зварочваюцца. Рэдакцыя адказвае на лісты толькі пасьля далучэньня паштовае маркі або міжнароднага паштовага купону.**


© PDF: Kamunikat.org 2012 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2012